

ШТО ЗАМІНАЕ СЯМЕЙНЫМ РОДАМ

Сямейная газета

ЭКРАНІЗАЦЫЯ ВЯДОМАГА РАМАНА 16



Выдаецца з 9 чэрвеня 1917 г.

Родная газета на роднай мове

# ЗВЯЗДА

26 ВЕРАСНЯ 2019 г. ЧАЦВЕР № 183 (29050)

**ЦЫТАТА ДНЯ**



**Генадзь СВІДЗЕРСКІ, першы намеснік міністра прамысловасці:**

*«70 % прадукцыі прадпрыемстваў Міністэрства прамысловасці Беларусі ідзе на экспарт, пастаўкі ажыццяўляюцца ў 100 краін свету. Прадпрыемствы (за сем месяцаў бягучага года) спрацавалі з прыбыткам больш чым у 300 млн рублёў, выраблена прадукцыі больш чым на 9 млрд рублёў. Большая частка прадукцыі экспартуецца — як у Расію, іншыя краіны СНД, так і ў далёкае замежжа. Атрымана станоўчае сальда знешняга гандлю».*

# НА ВЯЧОРКІ Ў ЛЮБОНІЧЫ



Фота БелТА.

**Хочаце аднавіць сапраўдныя вясковыя вячоркі — калі раннімі восеньскімі вечарамі збіраліся ў адной хаце за традыцыйным рыштункам, часалі лён, пралі кудзелю ды воўну, ткалі, а тым часам і спявалі, і жартавалі? Тады вам у Кіраўскі раён, што на Магілёўшчыне. Прынамсі там, у Любонічах (у мясцовым доме культуры) усе патрэбныя для работы прадметы сабраныя ў адным месцы на адмысловай выстаўцы. Сабралі яе руплівыя народнай спадчыны Марыя і Іван САЛАНОВІЧЫ. Увесь рыштунак спраўны — на гэтым фота Марыя Craft Салановіч прадзе на адным з экспанатаў — калаўроце.**

## КОРАТКА

- **У Пекіне пачаў работу найбуйнейшы ў свеце міжнародны аэрапорт Дасін плошчай у 1 млн кв. м. Ён зможа абслугоўваць 45 млн пасажыраў да 2021 года і 72 млн — да 2025-га.**
- На $35 млн прадукцыі па выніках першага паўгоддзя адгрузіў БМЗ на сусветны рынак сталі ў сегменце металапракату для аўтамабілебудавання.
- **Найстарэйшая лячэбная ўстанова Мінска — 2-я гарадская клінічная бальніца сёлета святкуе 220 гадоў з дня свайго адкрыцця.**



- Чэмпіянат Беларусі па фотабёрдынгу пройдзе ў Мінску 6 кастрычніка.
- **У Пінску мужчына ў сварцы з-за нерухомасці пагражаў брату арбалетам.**

ISSN 1990 - 763X

Спецыяльны рэпартаж

# ПАТРУЛЬНАЯ ТАЦЦЯНА ЗАСТУПАЕ НА ДЗЯЖУРСТВА



Карэспандэнт «Звязды» прайшлася па маршруце з дзяўчынай-міліцыянерам

**«Яна крочыць па раёне ад двара і да двара, і на ёй зноў пагоны, з пісталетам кабура...» Не, гэта не пра дзядзьку Сцёпу, гэта пра прапаршчыка Таццяну АЗОНЧЫК, якая служыць у роце патрульна-паставой службы міліцыі Савецкага РУУС Мінска. Сустракаемся з ёй каля будынка РУУС. Яна вясёлая і смяшлівая дзяўчына, адразу з ходу расказвае, што аб «пагонах» марыла заўсёды, але не адразу рашылася кінуць сваю работу і пайсці ў міліцыю.**

СТАР. 13

Транспарт

# БЯСПЕЧНЫ ШЛЯХ: ЗІМОЙ І Ў ЦЕМРЫ

**Дарожнікі расказалі, як падрыхтаваліся да снегу і як засцерагчыся на трасе ўначы**

**Неабходную колькасць рэчываў для абслугоўвання дарог і забеспячэння на іх бяспекі ўзімку нарыхтуюць ужо ў кастрычніку. А для больш камфортнай язды траса М-1 павінна стаць аўтамагістраллю, ды і хуткасць на сталічных вуліцах таксама трэба павялічваць. Пра гэта і іншыя акалічнасці жыцця аўтадарог расказалі дарожнікі.**

## Хуткасныя праспекты і аўтамагістраль

Дзеля павышэння бяспекі ў цёмны час трэба заканадаўча забараніць рух пешаходаў, веласіпедыстаў, гужавога транспарту і трактарнай тэхнікі на трасах з павышаным хуткасным рэжымам, лічыць **Мікалай ЧАРНЮК, намеснік начальніка галоўнага ўпраўлення аўтамабільных дарог Міністэрства транспарту і камунікацый.**

СТАР. 4



Фота БелТА.